# Падрыхтоўка бібліятэкараў-краязнаўцаў у БДУ культуры і мастацтваў

Для сучаснага беларускага грамадства надзвычай актуальным з'яўляецца захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, выхаванне патрыятычна-свядомай і адказнай за лёс сваёй краіны моладзі. У вырашэнні гэтых праблемаў адметную ролю выконваюць айчынныя бібліятэкі, якія на працягу некалькіх дзесяткаў гадоў развіваюць краязнаўчую працу як адзін з найважных кірункаў сваёй дзейнасці. Беларускімі бібліятэкамі назапашаныя багатыя краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы, на аснове якіх аказваецца шырокі асартымент паслугаў карыстальнікам, вядзецца актыўная папулярызацыя краязнаўчых ведаў. Больш за тое, абласныя ўніверсальныя і публічныя бібліятэкі выступаюць як арганізатары краязнаўчага руху.

Многія бібліятэкары з'яўляюцца даследчыкамі роднных мясцінаў, удзельнічаюць у выхаванні моладзі. Неабходна адзначыць, што такія ўплывовыя міжнародныя арганізацыі, як ЮНЕСКА і ІФЛА (Міжнародная федэрацыя бібліятэчных асацыяцыяў), неаднаразова звярталі ўвагу на значнасць краязнаўчай працы бібліятэк і ў якасці найважных напрамкаў іх дзейнасці вызначалі захаванне і папулярызацыю рэгіянальнай культурнай спадчыны, выкарыстанне мясцовай інфармацыі для сацыяльна-эканамічнага і культурнага прагрэсу рэгіёнаў.

У бібліятэках Беларусі краязнаўчай працай займаюцца, як правіла, вопытныя, дасведчаныя і захопленыя сваёй справай бібліятэкары-бібліёграфы. У прафесійных колах і сярод карыстальнікаў бібліятэк у мінулым і сёння вядомыя імёны такіх выдатных спецыялістаў, як М. Сокал, Р. Чыгірова (НББ), К. Біруковіч (Гомельская АБ), А. Катлёнак (Магілёўская АУНБ), А. Гатоўская (Маладзечанская ЦБ), Г. Захаранка (Светлагорская ЦБС) і інш. Вядома, што сапраўдны бібліятэкар-краязнаўца – гэта ўнікальны спецыяліст сферы інфармацыі, веды, уменні, навыкі якога набываюцца і фарміруюцца ўсё працоўнае жыццё, і невыпадкова, што ў некаторых бібліятэках, нават абласных, узнікаюць праблемы кадравага забеспячэння краязнаўчай дзейнасці. Беспярыпынна па-глыбліваю веды аб краі, бібліятэкар-краязнаўца ў сучасных умовах павінен ведаць асноўныя арганізацыйныя формы краязнаўчага руху, асаблівасці інфармацыйных патрэбаў абслугоўваемага рэгіёну, структуру і асноўныя характарыстыкі краязнаўчых дакументных патокаў, спецыфіку бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці ў галіне краязнаўства.

Бібліятэчна-бібліяграфічная практыка на сённяшні дзень патрабуе ад спецыяліста ўмення выяўляць, ацэньваць і рэкламаваць розныя віды краязнаўчых матэрыялаў, ствараць і распаўсюджваць разнастайную прадукцыю краязнаўчага зместу, здзяйсняць арганізацыю бібліятэчна-бібліяграфічнай краязнаўчай працы, наладжваць узаемадзеянне з рознымі суб'ектамі краязнаўчага руху, весці плённую навукова-даследчую працу.

Усведамляючы значнасць і складанасць праблемаў кадравага забеспячэння краязнаўчага кірунку дзейнасці айчынных бібліятэк, на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў была адкрытая спецыялізацыя «бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства», першы выпуск якой адбыўся ў 2001 г. Цяпер набор ажыццяўляецца як на дзённую форму навучання, так і на завочны факультэт. Большасць студэнтаў-завочнікаў валодаюць цікавым вопытам краязнаўчай працы, інфармацыйнага забеспячэння разнастайных рэгіянальных праблемаў, таму з ахвотай паглыбляюць прафесійныя веды па гэтым кірунку. Распрацаваны вучэбны план, які прадугледжвае вывучэнне гісторыі айчыннага краязнаўства і інфармацыйна-дакументных рэсурсаў краязнаўства, арганізацыі і тэхналогіі камплектавання фонду бібліятэкі краязнаўчымі матэрыяламі, асаблівасцяў індэксавання краязнаўчай літаратуры, методыкі і тэхналогіі яе бібліяграфавання, а таксама краязнаўчай дзейнасці дзіцячых і школьных бібліятэк. Спецыялізацыя замацаваная за кафедрай тэорыі і гісторыі інфармацыйнадакументных камунікацый. Дысцыпліны спецыялізацыі чытаюць кандыдаты педагагічных навук дацэнты В.І. Саітава і А.В. Прадзеіна, кандыдат філалагічных навук дацэнт В.М. Бігеза.



*Выкладчыкі кафедры гісторыі і тэорыі інфармацыйна-дакументных камунікацый*

У працэсе падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў – краязнаўцаў выкарыстоўваюцца розныя формы вучэбнай, выхаваўчай і даследчай працы. Выкладчыкі імкнуцца не толькі перадаць студэнтам веды, неабходныя для паспяховай прафесійнай дзейнасці, сфарміраваць уменні і навыкі, але і выхаваць чулае і зацікаўленае стаўленне да вывучэння і даследавання любой мясціны роднай Беларусі. Для гэтага выкарыстоўваюцца сустрэчы з вядомымі даследчыкамі-краязнаўцамі, наведванні музеяў і выставаў, экскурсіі, удзел у канферэнцыях і іншыя формы. Так, студэнты спецыялізацыі прынялі актыўны ўдзел у прэзентацыі і навуковым абмеркаванні ўнікальнага краязнаўчага выдання «Хроніка Убарцкага Палесся». Яны з захапленнем слухалі аўтара – Анатоля Атнагулава, выдатнага даследчыка Лельчыцкага краю Гомельшчыны, вядомых беларускіх вучоных, пісьменнікаў і выдаўцоў М. Спірыдонава, У. Свяжынскага, В. Насевіча, Я. Янушкевіча, А. Каўруса, В. Скалабана, З. Санько, В. Хурсіка і інш. Пад час прэзентацыі студэнты не толькі пазнаёміліся з адным з лепшых сучасных выданняў і знакамітымі беларускімі краязнаўцамі, але і адчулі непаўторную атмасферу захаплення роднай гісторыяй, культурай, радасць і задавальненне даследчыка ад пленнай працы. З удзячнасцю калектыў кафедры і студэнты прынялі каштоўны падарунак – экзэмпляр «Хронікі...» з аўтографам А. Атнагулава.

Цёплай і ўзрушанай была сустрэча з былымі выпускнікамі факультэта, а цяпер беларускімі пісьменнікамі Таісай Супрановіч і Андрэем Федарэнкам і прэзентацыя кнігі Т. Супрановіч «Матчын зарок». Творы Т. Супрановіч і А. Федарэнкі нясуць каларыт тых мясцінаў, дзе нарадзіліся і ўзраслі пісьменнікі, і ўдзельнікі творчай сустрэчы адчулі, як шчодра жывіць родная зямля слова, сюжэты і вобразы. Таленавітая пісьменніца і цікавы чалавек Таіса Іосіфаўна Супрановіч стала жаданым госцем студэнтаў, сустрэчы з ёю выклікаюць роздумы аб жыццёвых лёсах, прызначэнні чалавека шанаваць здабыткі духоўнай культуры народа, дбаць пра лад і парадак на роднай зямлі, у сваім доме.

Новыя магчымасці адкрыліся перад студэнтамі ў спазнанні краязнаўства са стварэннем на базе Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна і факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый вучэбнанавукова-вытворчага комплексу (ВНВК). Практычныя заняткі і іншыя формы вучэбнай дзейнасці пачалі праводзіцца ў краязнаўчым аддзеле абласной бібліятэкі, з яго багатымі інфармацыйнымі краязнаўчымі рэсурсамі. Студэнты ўдзельнічаюць у стварэнні інфармацыйнага прадукту і развіцці паслугаў бібліятэкі, у т.л. электронных інфармацыйных рэсурсаў па краязнаўстве, распрацоўваюць індывідуальныя праекты, атрымліваюць ацэнку сваёй працы як з боку выкладчыкаў, так і вопытных бібліятэчных спецыялістаў.

Нашыя студэнты пастаянна працуюць з «Краязнаўчай газетай» на практычных занятках, рыхтуючыся да семінараў, выконваючы курсавыя праекты. Яны ўсведамляюць арганізацыйную ролю газеты ў сучасным краязнаўчым руху, яе значнасць як дакументальнай крыніцы краязнаўчых ведаў. Цікавыя і карысныя сустрэчы праходзяць з прадстаўнікамі рэдакцыі «Краязнаўчай газеты» ў сценах універсітэта.

Экскурсіі па Мінску, іншых гарадах Беларусі, сустрэчы з многімі выдатнымі асобамі раскрываюць студэнтам шматгранны бакі краязнаўства. Сучасныя краязнаўцы, з якімі пазнаёміліся нашыя студэнты, – вучоныя, пісьменнікі, мастакі, інжынеры, бізнесмены і іншыя выклікаюць захапленне энцыклапедычнасцю ведаў, звязаных з родным краем, высокім інтэлектам і адукаванасцю, таленавітасцю і арганізаванасцю.

Інтарэс да краязнаўства ўплывае на выбар тэматыкі курсавых і дыпломных працаў, дакладаў на навуковых студэнцкіх канферэнцыях (між іншым, некаторыя навуковыя даследаванні атрымалі высокія катэгорыі на Рэспубліканскіх конкурсах навуковых працаў студэнтаў).

Усе формы вучэбнай і выхаваўчай дзейнасці накіраваныя не толькі на засваенне ведаў, але і на выхаванне адмысловага светапогляду бібліятэкара-краязнаўцы. Гэтага магчыма хутчэй дасягнуць, калі на спецыялізацыю «бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» паступаюць абітурыенты, неабыякавыя да роднай зямлі, да сваіх каранёў, схільныя да пошукава-даследчай працы. Набліжаюцца чарговыя ўступныя экзамены на факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый на дзённую і завочную формы навучання. Мы спадзяемся, што гэтая спецыялізацыя будзе карыстацца папулярнасцю сярод абітурыентаў і ў верасні яна папоўніцца здольнымі і таленавітымі студэнтамі, якія ў свой час прынясуць вялікі плён айчыннаму краязнаўству.

*Валянціна САІТАВА,*
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт БДУ культуры і мастацтваў*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ